*В.У.МАЗАНІК*

# АБ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ ГІСТОРЫІ РАЗВІЦЦЯ АРКЕСТРАВАЙ ВЫКАНАЎЧАСЦІ БЕЛАРУСІ

Перыядызацыя гісторыі развіцця аркестравай выканаўчасці распрацавана аўтарам з улікам цеснай узаемасувязі дадзенага віду выканальніцкага мастацтва з важнейшымі палітычнымі, эканамічнымі і сацыякультурнымі падзеямі, якія адбываліся ў Беларусі. На падставе праведзеных архіўных пошукаў, аналізу прац беларускіх мастацтвазнаўцаў, публікацый у перыядычным друку вызначаны асноўныя этапы развіцця буйнейшага і да цяперашнягя часу малавывучанага пласта айчыннай музычнай культуры. Перыядызацыя ў асноўным датычыцца XX ст., але ўлічваючы, што аркестравая выканаўчасць у Беларусі мае глыбокія карані, якія выяўляюцца яшчэ ў XVIII ст., час з XVII да пачатку XX ст. можа быць перыядам вытокаў аркестравай выканаўчасці.

Адной з першапачатковых формаў аркестравай выканаўчасці з'яўляецца інструментальная капэла (XVII—XVIII стст.). Традыцыі інструменталізму на беларускіх землях былі закладзены ў каталіцкіх рэлігійных храмах, дзе шырока выкарыстоўвалі музычны інструментарый. Музычнаму афармленню рэлігійных абрадаў каталіцкая царква надавала вялікае значэнне, таму інструментальная музыка заўсёды суправаджала богаслужэнні і культавыя святы. На тэрыторыі Беларусі пры уніяцкіх, езуіцкіх і пратэстанцкіх школах ствараліся ўласныя інструментальныя капэлы (Віцебск, Глыбокае, Гародня, Жыровічы, Нясвіж, Пінск, Полацк, Слуцк).

Даволі распаўсюджанымі былі ў XVIII ст. у Беларусі ваенныя аркестры, у склад якіх уваходзілі драўляныя і медныя інструменты. Ваенныя аркестры меліся у Бярэсці, Гародні, Навагрудку, Пінску, Слоніме, Слуцку і іншых гарадах, дзе існавалі ваенныя фарміраванні. Выканальніцкая практыка аркестраў была звязана ў асноўным з вайсковым жыццём і адпаведнымі яму атрыбутамі. Вядомы ў Беларусі і так званыя янычарскія аркестры (турэцкія ваенныя капэлы), якія запазычаны з Усходу. Звычайна ў сваім складзе яны мелі духавыя інструменты і вялікую колькасць ударных музычных інструментаў (барабаны, званочкі, талеркі і інш).

У XVIII ст. інструментальная выканаўчасць актыўна фарміравалася і ў свецкім асяроддзі. У Беларусі багатую выканальніцкую практыку мелі інструментальныя капэлы пры магнацкіх дварах, якія можна было пачуць на балях, гарадскіх святах ці на паляванні. У другой палове XVIII ст. развіццё аркестравай выканаўчасці актыўна стымуляваў музычны тэатр. Абапіраючыся на агульнаеўрапейскую гісторыю аркестравай выканаўчасці, адзначым, што зараджэнне аркестра (даследчыкі вызначаюць мяжу XVI—XVII стст.) і яго ўмацаванне звязаны са стварэннем свецкай інструментальнай музыкі. З узнікненнем у Італіі ў канцы XVI ст. оперы —новага музычнага жанру — па- трабаваліся і новыя адносіны да ансамбля інструментаў, якія суправаджалі сцэнічнае дзейства. Адметна, што кампазітарамі высока ацэньвалася роля інструментальнай музыкі ў оперы, яе разглядалі як адзін з асноўных кампанентаў музычнай драмы ці камедыі. Не выпадкова буйнейшыя інструментальныя капэлы ў Беларусі ўзнікалі менавіта пры магнацкіх тэатрах Нясвіжа, Гародні, Слоніма, Шклова, дзе ажыццяўляліся оперныя і балетныя пастаноўкі. Прафесійны ўзровень прыватных аркестраў у Беларусі быў даволі высокім. Інструментальныя капэлы Радзівілаў у Нясвіжы, М.К.Агінскага ў Слоніме, А.Тызенгаўза ў Гародні, А. і К.Сапегаў у Ружанах параўноўвалі з лепшымі музычна-выканальніцкімі калектывамі Еўропы.

Саставы інструментальных капэл укамплектоўваліся музычнымі інструментамі лепшых майстроў свету. Так, аркестр у Слоніме Міхала Казіміра Агінскага налічваў больш за сто музычных інструментаў, сярод якіх былі інструменты вядомых майстроў А.Амаці, Я.Ланга. У саставе аркестра ў Шклове ў 1783—1800 гг. было да сарака музыкантаў. Калі звярнуцца да іншых краін, то можна адзначыць, што сусветна вядомы Мангеймскі аркестр складаўся з трыццаці чатырох інструментаў, а аркестр князя Эстэргазі, у якога служыў Й.Гайдн, з чатырнаццаці. Дарэчы, колькасны састаў аркестраў, якасць музычных інструментаў спрыялі высокаму выканальніцкаму ўзроўню інструментальных капэл у Беларусі.

Для забеспячэння творчай дзейнасці прыватных інструментальных капэл ствараліся музычныя школы, дзе выкладалі лепшыя замежныя выкладчыкі і мясцовыя музыканты. Так, у Гародні аркестр А.Тызенгаўза складаўся з прыгонных сялян, якія атрымлівалі музычную адукацыю ў школе пры двары графа. Нясвіжская школа рыхтавала выканаўцаў на скрыпцы, віяланчэлі, флейце, габоі, валторне, фагоце, трубе. У школу прымалі дзяцей прыгонных сялян з розных маёнткаў Радзівілаў (Нясвіж, Ляхавічы, Слуцк). Музычныя школы, дзе навучаліся дзеці з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навакольных вёсак, існавалі пры тэатры М.К.Агінскага ў Слоніме, тэатры А. і К.Сапегаў у Ружанах, пры капэле Г.Радзівіла ў Слуцку. Такім чынам, былі створаны ўмовы для станаўлення айчыннай музычнай адукацыі.

Шырокае распаўсюджванне аркестравых калектываў у XVIII ст. са- дзейнічала не толькі фарміраванню аркестравых саставаў, але і стымулявала з'яўленне ў Беларусі першых дырыжораў. Адначасова з замежнымі — італьянцамі, чэхамі, немцамі — працавалі дырыжоры, што выйшлі з асяроддзя мясцовых музыкантаў. Аркестр А.Тызенгаўза ў Гародні ўзначальваў скрыпач Л.Сітанскі, капельмастрамі аркестра тэатра графа С.Зорыча ў Шклове былі прыгонныя музыканты А.Зорка і І.Стэфані, высокага прафесійнага майстэр- ства дасягнула капэла Г.Радзівіла ў Слуцку, кіраўнікамі якой былі таксама прыгонныя музыканты Е.Бакановіч і Я.Цэнцыловіч. Гэта першыя айчынныя дырыжоры ў гісторыі музычнага мастацтва Беларусі.

На стан музычнай культуры Беларусі заўсёды ўплывалі шматлікія аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, і менавіта існаванне ў XVIII ст. своеасаблівага прыдворна-арыстакратычнага асяроддзя спрыяла высокаму ўздыму інструментальнай выканаўчасці. Адметна, што з распадам палацава-арыстакратычнай культуры паступова знікалі музычныя тэатры і, як вынік, інструментальныя капэлы магнатаў-меламанаў. Але на тэрыторыі Беларусі прыватныя музычныя тэатры, інструментальныя капэлы, існаваўшыя ў XVIII ст., выканалі гістарычную функцыю — садзейнічалі фарміраванню прафесійнага выканальніцкага мастацтва, падрыхтоўцы айчынных выканаўцаў-інструменталістаў і дырыжораў.

Музычная культура XIX — пачатку XX ст. мае характэрныя рысы, адметныя асаблівасці і праявы ў галіне аркестравай выканаўчасці. XIX ст. характарызуецца больш дэмакратычным музычным мастацтвам, якое ахоплівала шырокае кола аматараў музыкі. Побач з дзе-нідзе захаванымі ў пачатку XIX ст. прыватнымі інструментальнымі капэламі ў гарадскіх скверах і на плошчах розных гарадоў гучала музыка ў выкананні духавых, струнных аркестраў. Тут можна было пачуць сімфанічную і камерна-інструментальную музыку кампазітараў Й.Гайдна, В.А.Моцарта, Л.Бетховена, Л.Бакерыні, І.Граўна, Я.Стаміца і інш.

У 1803 г. у Мінску быў арганізаваны гарадскі аркестр, які з перапынкамі існаваў да 1917 г. У розныя гады аркестр узначальвалі браты Іван і Казімір Вяржбіцкія, пазней — вядомыя ў Мінску музыканты В.Стэфановіч і А.Чартовіч. У XIX ст. аркестравая выканаўчасць атрымала шырокае распаўсюджанне ў вучэбных установах. Пры гімназіях, пансіёнах, вучылішчах і нават праваслаўных культавых установах ствараліся ўласныя аркестры, напрыклад у Магілёўскай духоўнай семінарыі і гімназіі ў Гародні (кіраўнік І.Дабравольскі), Магілёўскай мужчынскай гімназіі (кіраўнік М.Лусгартэн) і інш. Сістэматычныя канцэрты аркестраў садзейнічалі распаўсюджванню музычнага мастацтва сярод слухачоў, вызначалі культурнае і мастацкае жыццё гарадоў.

На мяжы XIX—XX стст. музычнае мастацтва Беларусі характарызуецца новай тэндэнцыяй — узнікненнем музычна-грамадскіх арганізацый, мэтай якіх было развіццё музычнай культуры і асветніцкай дзейнасці сярод насельніцтва. Традыцыі аркестравай выканаўчасці закладваюцца ў буйных гарадах: Віцебску, Мінску, Гомелі і Магілёве.

Такім чынам, у XVII — пачатку XX ст. выяўлены наступныя формы бытавання аркестравых калектываў у Беларусі:

1) інструментальныя капэлы ў рэлігійных храмах;
2) свецкія аркестры ў прыватнаўласніцкіх музычных тэатрах;
3) аркестры ў навучальных установах;
4) гарадскія і ваенныя аркестры.

Аркестравая выканаўчасць Беларусі XX ст. прадстаўлена аркестравымі калектывамі і дырыжорамі, вядомымі як у нашай краіне, так і за яе межамі*. Аналіз творчай дзейнасці вядучых аркестраў Беларусі XX ст. дазволіў вызначыць наступныя этапы развіцця аркестравай выканаўчасці:

1) 1918-ы — 1920-я гг.;
2) 1930-я — пачатак 1950-х гг.;
3) 1950 — 1960-я гг.;
4) 1970 — 1980-я гг.;

* Аб гэтым перыядзе намі апублікаваны шэраг артыкулаў у 1997—2002 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5) 1990-я — 2000-ы гг.

1918-ы — 1920-я гг. у гісторыі музычнай культуры Беларусі — гэта час глабальных пераўтварэнняў, нацыянальна-культурнага адраджэння, спрыяльны для развіця не толькі музычнага мастацтва, але і культуры Беларусі ўвогуле. Развіццё нацыянальнай культуры і яе бурны росквіт былі абумоўлены такімі фактарамі, як станаўленне дзяржаўнай незалежнасці і пераход да палітыкі беларусізацыі. 1920-я гг. для Беларусі сталі таксама гадамі падрыхтоўкі прафесійных кадраў у музычным мастацтве. У новых гістарычных умовах нараджаліся аркестры. Функцыянаванне сімфанічных аркестраў у Віцебску, Магілёве, Гомелі, Мінску пад кіраўніцтвам дырыжораў М.Малько, С.Пеўзнера, С.Захарына, М.Купера, А.Бяссмертнага, І.Гітгарца садзейнічала арганізацыі ў 1927 г. Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра ў Беларусі (з 1937 г. — сімфанічны аркестр Белдзяржфілармоніі). Для стварэння аркестравага калектыву высокага прафесійнага ўзроўню меліся пэўныя ўмовы. Перш за ўсё гэта:

а) наяўнасць прафесійных дырыжораў, такіх як А.Бяссмертны, М.Купер, І.Гітгарц, якія мелі не толькі высокую кваліфікацыю, але і валодалі арганізатарскімі якасцямі для стварэння аркестравых калектываў;

б) інтэнсіўная дзейнасць Мінскага музычнага тэхнікума па падрыхтоўцы прафесійных музыкантаў-інструменталістаў, здольных выконваць функцыі артыстаў аркестра.

Асаблівасцю мастацкага жыцця з’яўлялася асветніцкая дзейнасць аркестраў, якая спалучала ў сабе выканаўчасць з практыкай правядзення агульнадаступных лекцый перад канцэртнымі выступленнямі.

Этап 1930 — пачатку 1950-х гг. звязаны з развіццём менавіта аркестравага выканальніцкага мастацтва. Для яго характэрны якасна новы ўзровень выканаўчасці аркестравых калектываў і станаўлення дырыжорскай адукацыі ў Беларусі. Адкрыццё Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (1932), Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР (1933), Беларускай дзяржаўнай філармоніі (1937) садзейнічала прафесійнаму развіццю розных галін музычнага мастацтва і, безумоўна, аркестравай выканаўчасці. На дадзеным этапе ўстанавілася цесная творчая сувязь з майстрамі рускай дырыжорскай школы і замежнымі дырыжорамі. Уплыў розных дырыжорскіх школ на выканальніцкую культуру беларускіх музыкантаў станоўча адбіваўся на выніках сумеснай творчай работы, мастацкіх пошукаў і рашэнняў.

Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве 1940 г. паказала высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства сімфанічных аркестраў Белдзяржфілармоніі, Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, Дзяржаўнага аркестра беларускіх народных інструментаў.

З адкрыццём Белдзяржкансерваторыі пачалася планамерная падрыхтоўка не толькі высокакваліфікаваных салістаў-інструменталістаў, вакалістаў, кампазітараў, але і аркестрантаў і ўпершыню ў гісторыі музычнай адукацыі Беларусі — аркестравых дырыжораў. Агульнапрынята, што дырыжорская адукацыя ў Беларусі бярэ пачатак у 1937 г., калі ў кансерваторыі быў адкрыты клас оперна-сімфанічнага дырыжыравання, які ўзначаліў вядомы дырыжор І.Мусін. Першымі студэнтамі сталі артысты сімфанічнага аркестра Белдзяржфілармоніі Д.Карасік, Б.Кунін, І.Гольдберг, С.Ратнер, М.Рыўкін. Упершыню дырыжыраванне выкладалася як самастойная дысцыпліна, і оперна-сімфанічны клас даваеннага часу даў беларускаму музычнаму мастацтву прафесійных дырыжораў.

Актыўнае развіццё аркестравай выканаўчасці было перапынена пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Другая палова 1940-х гг. разглядаецца як перыяд аднаўлення, у час якога наладзілі сваю творчую дзейнасць вядучыя аркестравыя калектывы краіны. Практычна толькі ў пачатку 1950-х гг. аркестравая выканаўчасць па якасных і колькасных параметрах выйшла на ўзровень даваенных часоў. Менавіта гэтым абумоўлена прапанаваная перыядызацыя гісто-рыі развіцця аркестравай выканаўчасці, якая ўключае этап 1930 — пачатак 1950-х гг.

1950—1960-я гг. — гэта гады росквіту аркестравай выканаўчасці, звязанай з дзейнасцю такіх яркіх прадстаўнікоў рускай дырыжорскай школы, як В.Дуброўскі, В.Катаеў. У тэатры оперы і балета працавалі дырыжоры высокага прафесійнага ўзроўню Т.Каламійцава, Л.Любімаў, І.Абраміс. Дырыжоры І.Жыновіч, М.Рыўкін, С.Ратнер, В.Барсаў стваралі спрыяльныя ўмовы для творчага росту Дзяржаўнага народнага аркестра. У пасляваенныя і асабліва ў 1950-я гады фарміравалася творчая накіраванасць першых выпускнікоў класа оперна-сімфанічнага дырыжыравання Белдзяржкансерваторыі (гэты клас з 1937 г. узначальваў І.Мусін, пасля вайны — А.Брон і Р.Рубінштэйн), удасканальвалася дзейнасць дырыжораў М.Рыўкіна, С.Ратнера, І.Абраміса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1960-я гг. разглядаюцца як новы этап у развіцці дырыжорскай адукацыі ў краіне. Пасля доўгага перапынку (з 1949 г. дырыжыраванне выкладалася толькі на кафедры народных інструментаў) у кансерваторыі ў 1966 г. зноў быў адкрыты клас оперна-сімфанічнага дырыжыравання пад кіраўніцтвам В.Катаева. Таленавіты музыкант і настаўнік падрыхтаваў плеяду вучняў, якія сталі вядучымі дырыжорамі і выкладчыкамі: народны артыст Рэспублікі Беларусь, галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра РБ імя І.Жыновіча М.Казінец; дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета РБ Л.Лях; галоўны дырыжор сімфанічных аркестраў Беларускага тэлебачання і радыё і Дзяржаўнага музычнага тэатра Беларусі А.Лапуноў; дырыжор Брэсцкага камернага аркестра А.Мартыненка; дырыжоры С.Кафанаў, З.Шаціла, дацэнты кафедры аркестравага дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, і інш.

Такім чынам, паступова складвалася сістэма дырыжорскай адукацыі ў Беларусі.

Этап, храналагічныя рамкі якога ахопліваюць 1970—1980-я гг., у музычнай культуры Беларусі вызначаецца як складаны і супярэчлівы. У гэты час назіраецца зніжэнне цікавасці слухачоў да сімфанічнай музыкі, оперных па- становак і ў цэлым да беларускага музычнага мастацтва. І тым не менш аркестравая выканаўчасць дадзенага этапу звязана з такімі імёнамі, як І.Абраміс, А.Анісімаў, Я.Вашчак, Т.Каламійцава, М.Калядка, М.Казінец, Л.Лях, У.Машэнскі, Г.Праватораў, А.Энгельбрэхт, Ю.Яфімаў. Асобныя пастаноўкі і канцэрты пад кіраўніцтвам дырыжораў высокага прафесійнага ўзроўню станавіліся падзеяй не толькі ў музычным жыцці краіны, але і за яе межамі.

Апошняе дзесяцігоддзе XX ст. для развіцця аркестравай выканаўчасці стала асаблівым. Палітычныя, сацыяльныя ўмовы ў пачатку 1990-х гг. спрыялі адраджэнню нацыянальнай культуры, садзейнічалі працэсу ўзбагачэння ў шмат якіх сферах музычнага мастацтва. Шырокае распаўсюджанне аркестравая выканаўчасць атрымала ў Гродне, Гомелі, Брэсце, Магілёве, Маладзечне і іншых гарадах Беларусі. Дырыжоры вядучых аркестравых калектываў краіны (А.Берын, У.Борматаў, А.Галанаў, П.Вандзілоўскі, А.Высоцкі, Л.Іваноў, А.Лапуноў, Л.Лях, А.Мартыненка, У.Рыжкоў, С.Сакалоў, Р.Сарока, А.Сасноўскі, В.Чарнуха, А.Шакура, М.Фінберг) з'яўляюцца выхаванцамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Побач з масцітымі майстрамі маладыя дырыжоры з поспехам прадстаўляюць нацыянальную музычную культуру за мяжой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ